# РУСКАЯ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЯ, САВЕЦКАЯ І СУЧАСНАЯ РАСІЙСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПА ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВКЛ І МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ КАНЦА XVI ст.

**С. А. Лашкевіч**

*У артыкуле прааналізавана расійская гістарыяграфія па ўзаемаадносінах Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы ў канцы XVI ст. Даследчык вылучыў тры перыяды ў гістарыяграфіі пазначанай праблемы: дарэвалюцыйную гістарыяграфію, гістарыяграфію савецкага перыяду і сучасную гістарыяграфію. Пад пільнай увагай аўтара аказаліся даследаванні некалькіх дзясяткаў расійскіх даследчыкаў пачынаючы ад навуковых прац М. М. Шчарбатава і заканчваючы працамі апошняга дзесяцігоддзя.*

Сапраўды новым этапам у даследаванні знешнепалітычнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) можна лічыць перыяд з 1991 г., калі Беларусь набыла дзяржаўную самастойнасць і выйшла на міжнародную арэну як незалежны суб'ект міжнароднага права і міжнародных адносін. Пад пільнай увагай экспертаў аказаўся вялікі перыяд знешнепалітычнай дзейнасці Вялікага Княства Літоўскага ад часоў вялікага князя Міндоўга (XIII ст.) і да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. Маскоўскі накірунак дыпламатыі ВКЛ быў адным з самых складаных у другой палове XVI ст., што было абумоўлена ваенным супрацьстаяннем з Маскоўскай дзяржавай падчас Інфлянцкай вайны, рознасцю знешнепалітычных інтарэсаў палітычнай эліты Кароны Польскай і ВКЛ, а таксама шведскім, аўстрыйскім, крымскім, татарскім і іншымі фактарамі.

Трэба адзначыць, што дадзенай праблематыкай займалася вельмі нязначная колькасць як айчынных, так і замежных спецыялістаў, што тлумачыцца спецыфікай праблематыкі, а таксама вельмі вузкім храналагічным перыядам даследавання. За апошнія 20 гадоў было некалькі спроб прааналізаваць працы па знешнепалітычнай і дыпламатычнай гісторыі ВКЛ XVI—XVII стст. Так, сярод беларускіх даследчыкаў можна назваць прозвішчы Г. Я. Галенчанкі і А. М. Янушкевіча [16; 82], сярод расійскіх даследчыкаў — А. І. Філюшкіна і А. В. Кузьміна [33; 69], літоўскага даследчыка М. Сірутавічуса [57], польскага даследчыка Г. Блашчыка [83], украінскіх вучоных К. В. Кірычэнка і В. А. Васіленка [13; 26].

Мэта дадзенага даследавання — прааналізаваць рускую дарэвалюцыйную, савецкую і сучасную расійскую гістарыяграфію па знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы канца XVI ст.

Расійская гістарыяграфія па ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы прадстаўлена вельмі шырока, і звязана гэта са многімі прычынамі. Па-першае, у Маскве знаходзяцца ў сваёй большасці архіўныя матэрыялы і дакументы, звязаныя з узаемадачыненнямі дзвюх краін, што не стварала перашкод у іх пошуку і ўвядзення ў навуковы абарот для даследчыкаў (як прыклад: 79 фонд РДАСА). Па-другое, расійскія даследчыкі фактычна першымі, па аб'ектыўным і шматлікім прычынам, пачалі распрацоўваць тэматыку ўзаемаадносін Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы (канец XVIII ст.), праўда, не звяртаючы ўвагу на знешнепалітычную пазіцыю ВКЛ. Па-трэцяе, зыходзячы з другой прычыны, як прыклад, беларуская і ўкраінская гістарыяграфіі больш маладыя, і рэальная распрацоўка дадзенай праблемы пачалася ў гэтых краінах толькі з набыццём незалежнасці ў 90-я гг. XX ст. Тым не менш расійская гістарыяграфія па знешнепалітычнай праблематыцы пры даследаванні адносін Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы не поўнасцю (альбо зусім) улічвала знешнепалітычны фактар і інтарэсы Вялікага Княства, што было звязана з навуковымі канцэпцыямі поўнай несамастойнасці і падпарадкаванасці ВКЛ пасля Люблінскай уніі 1569 г. польскаму палітычнаму ўплыву.

Умоўна расійскую гістарыяграфію можна падзяліць на тры перыяды: дарэвалюцыйную гістарыяграфію, гістарыяграфію савецкага перыяду і сучасную гістарыяграфію. Найбольшую цікавасць для нас уяўляюць дарэвалюцыйныя навуковыя працы і даследаванні апошніх 20 гадоў, так як яны не ўтрымліваюць класавага падыходу марксісцка-ленінскай тэорыі.

Першай фундаментальнай навуковай працай, дзе разглядаліся ўзаемадачыненні Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы, можна лічыць 7-томнае даследаванне М. М. Шчарбатава «История Российская от древнейших времен» [76—78]. Шосты і сёмы тамы прысвечаны нашаму храналагічнаму перыяду. Пры напісанні працы даследчык карыстаўся пераважна дакументамі 79 фонда (сучасны РДАСА), які змяшчае адносіны Расіі з Польшчай. У даследаванні адносінам з Рэччу Паспалітай надаецца вялікая ўвага. Аўтар падрабязна разглядае падзеі трэцяга перыяду бескаралеўя ў Рэчы Паспалітай, аналізуе пралікі дыпламатыі Масквы ў справе выбрання Фёдара Іванавіча на каралеўскі трон. М. М. Шчарбатаў, як не адзін наступны даследчык, звярнуў сваю ўвагу на асаблівую ролю прадстаўнікоў ВКЛ у дыпламатычных адносінах Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы. Ты не менш даследчык зусім павярхоўна адлюстраваў дыпламатыю дзвюх дзяржаў у перыяд 1592—1597 гг., што з'яўляецца недахопам працы. Не была паказана выключная пазіцыя ВКЛ у прадстаўленні знешнепалітычных інтарэсаў Шведскага Каралеўства. Пры гэтым рускі гісторык прытрымліваецца думкі, што з 1599 г. пачынаецца якасна новы перыяд ва ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы. П. А. Муханаў у 1834 г. надрукаваў працу па адносінах дзвюх краін пераважна пачатку XVII ст. [50].

Дыпламатыю Маскоўскай дзяржавы падчас трэцяга бескаралеўя падрабязна разгледзеў М. М. Карамзін у сваёй працы «История государства Российского». Вельмі цяжка пагадзіцца з выказваннем даследчыка наконт таго, што «Федор, подобно отцу и деду, искренно хотел королевского сана, чтобы соеденить державы», так як дыпламатыя Масквы была накіравана больш на стварэнне ваенна-палітычнага саюзу супраць татар і туркаў, чым на ўзвядзенне на трон Рэчы Паспалітай маскоўскага прадстаўніка [25, с. 83].

Знешнепалітычнай праблематыкай Маскоўскай дзяржавы, а потым і Расіі на аснове дакументаў пасольскага прыказа займаўся М. М. Бантыш-Каменскі. Многія яго навуковыя працы былі апублікаваны толькі пасля яго смерці. У 1861 г. была надрукавана «Переписка между Россией и Польшей по 1700 год», праўда, за перыяд 1487—1584 гг., а ў 1897 г. — «Обзор внешних сношений России (по 1800 год)», дзе былі адлюстраваны і адносіны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай [5; 48]. Не абышоў даследчык і праблему Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. і яе ўплыву на працэсы ў Рэчы Паспалітай [4].

Падобным да працы М. М. Карамзіна з'яўляецца даследаванне С. М. Салаўёва «История России с древнейших времен», у якой прааналізаваны ў тым ліку і дыпламатычныя адносіны дзвюх краін у канцы XVI ст. Знешнепалітычныя інтарэсы ВКЛ гісторык разглядае фрагментальна, наколькі гэта дазваляе кантэкст даследавання. Найбольшай праявай уласных інтарэсаў Княства аўтар лічыць менавіта перыяд трэцяга бескаралеўя ў Рэчы Паспалітай [63; 64].

Узаемаадносіны дзвюх дзяржаў разгледзеў у сваіх працах М. І. Кастамараў [27—29]. Аўтар звяртае ўвагу на бурны рост у канцы XVI ст. гандлёвых адносін паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Так, па словах гісторыка, літвінскія купцы ў Маскве ў гэты перыяд займалі першае месца сярод замежных гандляроў [27, с. 210—211].

С. Ф. Платонаў у сваёй працы адзначае выключную ролю Б. Гадунова пры рэалізацыі знешняй палітыкі Масквы на заходнім накірунку. На думку аўтара, літвіны ў 1587 г. самі ініцыіравалі ўмовы уніі. Тым не менш перамір'е 1587 г. ён разглядае як польска-маскоўскае [49, с. 179—180].

Умовы Люблінскай уніі і становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай прааналізаваў рускі гісторык М. В. Каяловіч [30; 31; 32]. Справядліва даследчык падкрэсліваў, што галоўная розніца паміж ВКЛ і Каронай Польскай была ў тым, што ў Кароне шляхецтва было мацней, чым у ВКЛ, і, каб паслабіць пазіцыі магнатаў Княства, палякі зрабілі палітычную стаўку пры заключэнні уніі на шляхту Княства [21, с. 88]. Блізкія па характары даследаванняў з'яўляюцца працы М. К. Любаўскага, які разглядаў палітычную гісторыю і прадстаўніцтва на соймах ВКЛ [39; 40] і У. Б. Антановіча, разглядаўшага палітычную гісторыю ВКЛ у далюблінскі перыяд [1]. У 1889 г. П. Д. Бранцаў надрукаваў працу, прысвечаную гісторыі Літвы са старажытных часоў [11]. У 1912 г. была надрукавана праца расійскага даследчыка Л. А. Арбузава, прысвечаная гісторыі прыбалтыйскіх народаў, дзе былі разгледжаны Інфлянты, Эстляндыя і Курляндыя [2].

І. І. Лапо разгледзеў палітычную гісторыю ВКЛ у паслялюблінскі перыяд [34]. На жаль, знешнепалітычная і ўнутрыпалітычная гісторыя ВКЛ у гады Жыгімонта III не была адлюстравана — гісторык спыніўся ў сваёй працы на 1586 г. [35]. П. М. Бацюшкаў даследаваў гісторыю паўночна-заходняга краю [8].

Папярэдні перыяд міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе разгледзеў расійскі даследчык пад псеўданімам В. В. Навадворскі (сапраўднае прозвішча В.В. Сіпоўскі) [43; 44]. У сваіх працах аўтар аналізуе пазіцыю дзяржаў падчас Інфлянцкай вайны, а таксама Інфлянты як мяжу супрацьстаяння дзвюх дзяржаў.

Адным з недахопаў савецкай гістарыяграфіі пры вывучэнні міжнародных адносін і знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай пазначанага перыяду з'яўляецца марксісцка-ленінскі класавы падыход і адсутнасць ВКЛ як суб'екта міжнародных адносін на палітычнай мапе ў паслялюблінскі перыяд, што стварала няпоўную карціну тагачаснай міжнароднай сітуацыі і абмежаванасць навуковых прац. Знешнепалітычныя інтарэсы літвінаў у другой палове XVI ст. разглядаліся як супярэчнасці паміж сенатарамі Рэчы Паспалітай.

А. Я. Праснякоў у сваёй працы «Лекции по русской истории. Западная Русь и Литовско-русское государство» вялікую ўвагу надаваў паслялюблінскай гісторыі ВКЛ [51]. Гісторык паказвае выключную ролю сенатараў ВКЛ падчас трэцяга бескаралеўя ў Рэчы Паспалітай, якая па сваёй сутнасці межавала з жаданнем разарваць уніі з палякамі [51, с. 234]. Даследчык аддае першасную ролю дыпламатычнай службе ВКЛ у падрыхтоўцы і рэалізацыі знешняй палітыкі адносна Маскоўскай дзяржавы [51, с. 236].

Юрыдычна-прававаым аспектам жыццядзейнасці Рэчы Паспалітай у другой палове XVI ст. прысвечаны працы К. Я. Ліванцава [36; 37]. Аб'ектам даследавання аўтара спецыяльна не з'яўляецца знешняя палітыка ВКЛ.

У другой палове XX ст. было надрукавана шэраг агульных навуковых прац па міжнародных адносінах ва Усходняй Еўропе такіх даследчыкаў, як І. Б. Гэкава, У. Д. Каралюка, Г. Л. Харашкевіч, С. У. Бахрушына, Б. М. Флоры, М. М. Ціхаміравa, Р. Г. Скрыннікава, Л. А. Дзербава, В. П. Мальцава і інш. [6; 19; 20; 42; 58; 59; 66; 67; 70—75; 84 і інш.].

Расійскі вучоны М. М. Ціхаміраў у сваёй працы «Россия в XVI столетии» растлумачвае правільнасць ужывання тэрмінаў «Расія», «Руская дзяржава» і «Маскоўская дзяржава». Даследчык адзначае, што тэрмін «Маскоўская дзяржава» мае права на існаванне, але толькі для гісторыі XVI—XVII стст., паколькі гэта назва ўжывалася ў афіцыйных дакументах XVI ст. заходнееўрапейскіх краін, у тым ліку і ў ВКЛ [67, с. 236].

Р. Г. Скрыннікаў даследаваў гісторыю Маскоўскай дзяржавы пераважна перыяду канца XVI — пачатку XVII ст. Вельмі цікавымі з'яўляюцца доказы гісторыка аб неаднароднас-

ці знешнепалітычных падыходаў некаторых баяр Маскоўскай дзяржавы да Рэчы Паспалітай, што ў сваю чаргу імкнуліся выкарыстаць дыпламаты Княства [58, с. 33—34]. Цікава, што палітычныя падзеі ў Маскоўскай дзяржаве ў пачатку 1598 г. гісторык раскрывае праз вывучэнне дыпламатычнай перапіскі літвінаў, а таксама з аналітычных лістоў шпіёнаў [58, с. 110—111]. Спрэчным з'яўляецца тэзіс даследчыка аб тым, што «перамір'е 1591 г. паміж дзяржавамі было буйным поспехам дыпламатыі Масквы» [59, с. 110—111]. На думку аўтара, у тых міжнародных умовах перамір'е было выгадна ўсім бакам, і ў першую чаргу Вялікаму Княству.

Наватарскай для канца 1970-х гг. і цікавай па сваім змесце з'яўляецца навуковая праца расійскага даследчыка Б. М. Флоры [74]. На аснове шматлікіх дакументальных крыніц маскоўскага, польскага і літоўскага паходжання аўтар прааналізаваў міжнародныя адносіны ва Усходняй Еўропе ў другой палове XVI — пачатку XVII ст. на прыкладзе ўзаемаадносін паміж такімі дзяржавамі, як Рэч Паспалітая, Маскоўская дзяржава, Шведскае Каралеўства, Асманская імперыя і Крымскае ханства. Недахопам працы з'яўляецца перакос у разуменні дыпламатычных кантактаў паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай, якія фактычна зводзіліся ў аўтара да знешнепалітычных праграм, накіраваных на аб'яднанне дзвюх дзяржаў. Аналіз крыніц літвінска-маскоўскага паходжання паказвае, што, як правіла, праблема аб'яднання ў перагаворах паміж дыпламатамі ВКЛ і Масквы стаяла на другім месцы, а пры абмеркаванні адкладвалася на наступны раз ужо праз некалькі хвілін цяжкіх дэбатаў. Фактычна за ўвесь разглядаемы перыяд дыпламаты ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы ні разу ні прыблізіліся да рэалізацыі гэтага геапалітычнага праекта. На нашу думку, правільна будзе гаварыць аб ваенна-палітычным саюзе дзвюх дзяржаў супраць знешняй пагрозы на паўднёва-ўсходнім накірунку, а знешнепалітычныя праграмы абедзвюх дзяржаў можна разглядаць як дыпламатычную гульню ВКЛ, Масквы і Кароны за ўплыў у дадзеным рэгіёне. Больш таго, Б. М. Флора ў сваім даследаванні прапусціў вялікі перыяд узаемаадносін дзяржаў, а менавіта — 1592—1597 гг., спасылаючыся на тое, што ўвага дзяржаў была скіравана на вырашэнне іншых знешнепалітычных пытанняў. Гэта не адпавядае рэчаіснасці, паколькі дыпламатычная служба ВКЛ працягвала напружана працаваць на ўсходнім накірунку, толькі змянілася праблематыка стасункаў. Эпізадычнае апісанне знешнепалітычных інтарэсаў ВКЛ на маскоўскім накірунку аўтар разглядае выключна як пазіцыю асобных сенатараў Княства з прымяненнем класавага падыходу.

Г. Л. Харашкевіч і Б. М. Флора і сёння працягваюць распрацоўку навуковых прац, звязаных з міжнароднымі адносінамі ва Усходняй Еўропе XVI — пачатку XVII ст. [10; 60; 72; 75].

У 1981 г. расійскі даследчык Л. А. Юзефовіч абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Посольский обычай Российского государства конца XV — начала XVII в.» [81]. Цэнтрам увагі гісторыка з'яўляюцца такія пытанні, як дыпламатычны цырыманіял пасольскага прыказа, асаблівасці вядзення перагавораў з замежнымі дыпламатамі, іерархія дыпламатаў, уплыў дыпламатычных традыцый замежных дзяржаў на дзейнасць пасольскага прыказа ў вывучаемы перыяд і інш. Так, аўтар адзначае, што «ў руска-літвінскай дыпламатычнай практыцы цар мог уступаць у перагаворы выключна з самім вялікім князем, баярская дума з панамі-радамі, смаленскі ваявода з аршанскім ваяводай і г. д.» [80, с. 34].

Арганізацыяй і функцыянаваннем пасольскага прыказа Маскоўскай дзяржавы ў канцы XV — пачатку XVII ст. займаюцца расійскія даследчыкі М. М. Рагожын, В. І. Гальцаў і інш. [17; 45; 52—55].

Сучаснае становішча расійскай гістарыяграфіі характарызуецца больш пільнай увагай да знешнепалітычных праблем Вялікага Княства Літоўскага. З'явілася шмат навуковых прац, прысвечаных міжнародным адносінам ва Усходняй Еўропе другой паловы XVI ст.

М. Я. Бычкова зрабіла параўнаўчы аналіз арганізацыі і функцыянавання дзяржаўных інстытутаў ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы толькі ў далюблінскі перыяд. Даследчыца справядліва адзначае, што «Рада ВКЛ мела больш незалежнасці ў параўнанні з Думай Маскоўскай дзяржавы, а сваю ўладу ажыццяўляла пасродкам канцылярыі княства» [12, с. 38—39].

Паўночны накірунак знешняй палітыкі Маскоўскай дзяржавы разгледзеў расійскі даследчык А. С. Кан у сваёй працы «Швеция и Россия в прошлом и настоящем» [24]. Паслядоўнікам Л. А. Юзефовіча з'яўляецца Д. У. Лісейцаў, які даследаваў арганізацыю і функцыянаванне пасольскага прыказа Маскоўскай дзяржавы ў пачатку XVII ст. [38].

М. І. Зарэзін у навукова-публіцыстычным плане ахарактарызаваў унутрыпалітычныя падзеі ў Маскоўскай дзяржаве канца XV — пачатку XVII ст. Аўтар адзначае, што ўнутрыпалітычнае становішча Б. Гадунова пасля адрачэння 15 студзеня 1598 г. царыцы Ірыны было вельмі хісткім, а першынства на царскі трон аддавалася Фёдару Раманаву [23, с. 405].

У апошнія 20 гадоў у расійскай гістарыяграфіі пашырылася цікавасць да рэлігійных пытанняў і іх уплыву на палітычныя працэсы ў дзяржаве. Для нас застаецца вельмі важным пытанне, наколькі Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. паўплывала на міжнародныя адносіны ў вывучаемым рэгіёне, а канкрэтна — на адносіны ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы. Трэба адзначыць, што мы не знайшлі аргументаваных доказаў уплыву дадзенай падзеі на стасункі дзвюх дзяржаў у вывучаемы перыяд. Больш таго, у апошнія тры гады нашага храналагічнага перыяду, пасля ўвядзення уніі, дадзеная праблема не падымалася на міждзяржаўным узроўні. У гэты перыяд справядліва будзе гаварыць аб унутрыпалітычных супярэчнасцях у Рэчы Паспалітай з нагоды ўвядзення ўніяцтва, чым аб знешніх. Верагодна, знешнепалітычны аспект уніяцтва ў Рэчы Паспалітай будзе востра стаяць у XVII ст. Сярод даследчыкаў дадзенага аспекту можна назваць дарэвалюцыйнага гісторыка В. А. Бяднова, а таксама сучасных даследчыкаў Б. М. Флору,

Л. В. Забароўскага, А. А. Турылава, М. В. Дзмітрыева і інш. [7; 10; 60; 62].

Гандлёвыя сувязі Маскоўскай дзяржавы з заходнімі краінамі, у тым ліку з Рэччу Паспалітай, у пазначаны перыяд даследаваў Р. С. Асташкін [3]. У 2007 г. была надрукавана манаграфія расійскага даследчыка А. В. Вінаградава «Русско-крымские отношения, 50-е — вторая половина 70-х годов XVI века» [15]. Нягледзячы на тое, што аўтар не разглядаў узаемаадносіны з ВКЛ і Рэччу Паспалітай, тым не менш, на думку аўтара, гэта былі найважнейшыя дзяржавы ў рэгіёне [15, с. 4].

У гэтым жа годзе выйшла з друку калектыўная праца расійскіх даследчыкаў пад назваю «Геополитические факторы во внешней политике России: вторая половина XVI — начало XX века» [18]. Цікава, што адносіны паміж дзяржавамі ў дадзеным даследаванні разглядаюцца як адносіны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, паколькі, па словах аўтараў, «Карона фармальна перадавала адносіны з Масквой дыпламатычнай службе ВКЛ» [18, с. 37]. Указваюцца прычыны, па якіх краіны так доўга не маглі заключыць вечны мір: гэта ўзаемнае непрызнанне тытулаў манархаў і тэрытарыяльныя супярэчнасці з-за Інфлянтаў [18, с. 38]. Звяртаючыся да перамір'я 1587 г., даследчыкі сцвярджаюць, што гэты дыпламатычны крок ВКЛ не вырашыў праблем паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай, паколькі міжнародны дакумент не быў зацверджаны каралём Рэчы Паспалітай [18, с. 85]. У цэлым знешняя палітыка Масквы ў адносінах да Рэчы Паспалітай у канцы XVI ст. характарызуецца як не зусім паспяховая: «На западном и северо-западном направлениях успехи Москвы к концу XVI в. оказались не столь впечатляющими. Балтийская проблема не была решена» [18, с. 95]. Тым не менш даследчыкі не разгледзелі ўвесь спектр знешнепалітычных інтарэсаў ВКЛ, што толькі звузіла карціну даследавання міжнародных адносін у рэгіёне.

Працягам знешнепалітычных даследаванняў, звязаных з фарміраваннем антытурэцкага саюзу, была абарона дысертацыі ў 2009 г. расійскай даследчыцай І. В. Магілінай на тэму «Московское государство и проект антитурецкой коалиции в конце XVI — начале XVII в.» [41]. У 2011 г. К. Ю. Ерусалімскі абараніў дысертацыю на тэму «Московиты в Польско-Литовском государстве второй половины XVI — начала XVII в.» [22]. Ускосна знешнепалітычную праблематыку можна знайсці ў працах расійскіх даследчыкаў па ўнутрыпалітычнай гісторыі Маскоўскай дзяржавы пазначанага перыяду. Так, можна назваць А. П. Паўлава, П. П. Васільева, А. Я. Тараса і інш. [9; 14; 46; 65; 68; 79].

Падводзячы вынік пад аналітычным аглядам расійскай гістарыяграфіі па вывучаемым пытанні, трэба адзначыць, што спецыяльнай комплекснай працы па знешнепалітычным інтарэсам і дыпламатыі ВКЛ у адносінах да Маскоўскай дзяржавы канца XVI ст. сёння не існуе. У расійскіх даследчыкаў верагодна застаюцца састарэлыя навуковыя падыходы савецкага перыяду аб несамастойнасці і поўнай падпарадкаванасці дыпламатычнай службы ВКЛ у паслялюблінскі перыяд польскаму ўплыву, што не дае магчымасці зрабіць крок наперад, каб пераадолець дадзеныя стэрэатыпы. Несумненна ў параўнанні з беларускай гістарыяграфіяй расійская прадстаўлена больш якасна і поўна. Як бачна з праведзенага аналізу, у апошні час расійскія даследчыкі пачалі актыўна ўводзіць у навуковы абарот дакументы па знешнепалітычнай гісторыі Маскоўскай дзяржавы канца XVI — пачатку XVII ст.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ ССЫЛКІ


1. *Антонович В., Иловайский Д.* История Великого княжества Литовского от найдавнейших часов до упадка удельной системы в Литовской Руси. — Тернополь : Тип. Иосифа Павловского, 1887. — 207 с.
2. *Арбузов Л. А.* Очерки истории Лифляндии, Эстляндии и Курляндии. — Пб. : Тип. М. М. Стасюлевича, 1912. — 296 с.
3. *Асташкин Р. С.* Россия и торговая экспансия европейцев: (вторая половина XVI—XVII вв.) : автореф. дис. ... на соиск. учен. степени канд. ист. наук: 07.00.02. — Самара, 2007. — 21 с.
4. *Бантыш-Каменский, Н. Н.* Историческое известие о возникшей в Польше унии, с показанием начала и важнейших, в продолжение одной чрез два века, приключений, паче же о бывшим от римлян и униятов на благочестивых тамошних жителей гонений: По высочайшему блаженные памяти императрицы Екатерины II повелению, из хранящихся Гос. Колегии Ин. дел. в Моск. арх. актов и разн. ист. кн. — Вильно, 1864. — 399 с.
5. *Бантыш-Каменский Н. Н.* Обзор внешних сношений России (по 1800 год). — М. : Тип. Э. Лисснера и Ю. Романа, 1897. – Ч. 3 : Курляндия, Лифляндия, Эстляндия, Финляндия, Польша и Португалия.— 319 с.
6. *Бахрушин С. В.* Иван Грозный. — М. : Госполитиздат, 1945. — 100 с.
7. *Беднов В. А.* Православная церковь в Польше и Литве: По Volumina legum. — Минск : Лучи Софии, 2002. — 430 с.
8. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-западного края. С высочайшего соизволения издано при М-ве внутр. дел П. Н. Батюшковым. — Пб. : Тип. т-ва «Общ. польза», 1890. — 183 с.
9. *Богданов А. П.* Первые российские дипломаты: (Ист. портр.). — М. : Знание, 1991. — 63 с.
10. Брестская уния 1596 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI — первой половине XVII в. / М. В. Дмитриев [и др.]. — М. : Индрик, 1996 (обл. 1999). – Ч. 2 : Брестская уния 1596 г. Исторические последствия события. — 197 с.
11. *Брянцев, П. Д.* История Литовского государства с древнейших времен / П.Д. Брянцев. — Вильна : Тип. А. Г. Сырнина, 1889. — 659 с.
12. *Бычкова М. Е.* Русское государство и Великое княжество Литовское с конца XV в. до 1569 г. Опыт сравнительно-исторического изучения политического строя. — М. : Ин-т российской истории РАН, 1996. — 173 с.

13. *Василенко В.* Дослідження політичної історії Великого князівства Литовського (до 1569 р.) в сучасній українській історіографії (1991—2003 рр.) // Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991—2003 гг. = Grand Duchy of Lithuania: history of research, 1991—2003 : матэрыялы міжнар. круглага стала «Гісторыя вывучэння Вялікага княства Літоўскага ў 1991—2003 гг.», Гродна (16—18 мая 2003 г.) / рэдкал. : С. Б. Каўн (адказ. рэд.) [і інш.]. — Мінск: Медисонт, 2006. — С. 499—508.
14. *Васильев П. П.* Тайны русской истории конца XVI — начала XVII в. — М. : Мысль, 1990. — 397 с.
15. *Виноградов А. В.* Русско-крымские отношения, 50-е — вторая половина 70-х годов XVI века / А. В. Виноградов. — М. : Издат. центр ИРИ, 2007. – Ч. 1. — 197 с.
16. *Галенчанка Г., Голубеў В.* Беларуская гістарыяграфія вывучэння гісторыі Вялікага княства Літоўскага ў 1990—2003 гг. : бібліягр. паказальнік // Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991—2003 гг. = Grand Duchy of Lithuania: history of research, 1991—2003 : матэрыялы міжнар. круглага стала «Гісторыя вывучэння Вялікага княства Літоўскага ў 1991—2003 гг.», Гродна (16—18 мая 2003 г.) / рэдкал. : С. Б. Каўн (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Медисонт, 2006. — С. 169—219.
17. *Гальцов В. И.* Архив Посольского приказа во второй пол. XVI — нач. XVII вв. // Археографический ежегодник за 1981 год / под ред. С. О. Шмидта. — М. : Наука, 1982. — С. 142—167.
18. Геополитические факторы во внешней политике России: вторая половина XVI — начало XX века: к 100-летию академика А. Л. Нарочницкого / А. В. Игнатьев [и др.]. — М. : Наука, 2007. — 358 с.
19. *Греков И. Б.* Очерки по истории международных отношений Восточной Европы в XIV—XVI вв. — М. : Изд.-во восточной литературы, 1963. — 374 с.
20. *Дербов Л. А.* Борьба русского государства за Прибалтику и Белоруссию в 60-х годах XVI в. // Учен. записки Саратов. гос. ун-та. — 1956. – Т. 47. Вып. исторический. — С. 149—181.
21. Документы, объясняющие историю Западно-Русского края и его отношения к России и к Польше / [собрал документы и составил исследование М. Коялович. — Пб., 1865.
22. *Ерусалимский К. Ю.* Московиты в Польско-Литовском государстве второй половины XVI — начала XVII в. : автореф. дис. ... д-ра истор. наук: 24.00.01 / К. Ю. Ерусалимский. — М., 2011. — 47 с.
23. *Зарезин М. И.* Последние Рюриковичи и закат Московской Руси. — М. : Вече, 2004. — 475 с.
24. *Кан А.* Швеция и Россия в прошлом и настоящем. — М., 1999. — 359 с.
25. *Карамзин Н. М.* История государства Российского : в 4 кн. ; [вступ. ст., коммент. к письмам: А. Ф. Смирнов ; сост., коммент.: А. М. Кузнецов]. — М. : РИПОЛ классик, 2001. – Кн. 4. Т. 10—12. — 734 с.
26. *Кириченко К.* Історія Великого князівства Литовского в українській історіографії 1991—2003 рр.: основні тенденції // Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991—2003 гг. = Grand Duchy of Lithuania: history of research, 1991—2003 : матэрыялы міжнар. круглага стала «Гісторыя вывучэння Вялікага княства Літоўскага ў 1991—2003 гг.», Гродна (16—18 мая 2003 г.) / рэдкал. : С. Б. Каўн (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Медисонт, 2006. — С. 487—498.
27. *Костомаров Н. И.* История Руси Великой : в 12 т. / сост. и примеч. С. Д. Ошевского. — М. : Мир книги, 2004. — Т. 9: Как жила Россия в старину. — 478 с.
28. *Костомаров Н. И.* О жизни, быте и нравах русского народа : сборник / авт. очерка о Н. И. Костомарове и И. Е. Забелине С. О. Шмидт. — М. : Просвещение : АО «Учеб. лит.», 1996. — 575 с.
29. *Костомаров Н. И.* Смутное время Московского государства в начале XVII столетия, 1604—1613. — М. : Чарли, 1994. — 800 с.
30. *Коялович М. О.* Дневник Люблинского сейма. Соединение Великого Княжества Литовского с Королевством Польским в 1569 г. — Пб. : Печатня Головина, 1869. — 786 с.
31. *Коялович М. О.* Лекции по истории Западной России. — М., 1864. — 394 с.
32. *Коялович М. О.* Люблинская уния, или Последнее соединение Литовского княжества с Польским королевством на Люблинском сейме в 1569 г. — М. : Университет. тип., 1863. — 87 с.
33. *Кузьмин А. В., Ерусалимский, К. Ю., Филюшкин, А. И.* Российская историография изучения истории Великого княжества Литовского в 1990—2003 гг. : библиогр. указатель // Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991—2003 гг. = Grand Duchy of Lithuania: history of research, 1991—2003 : матэрыялы міжнар. круглага стала «Гісторыя вывучэння Вялікага княства Літоўскага ў 1991—2003 гг.», Гродна (16—18 мая 2003 г.) / рэдкал. : С. Б. Каўн (адказ. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Медисонт, 2006. — С. 37—99.
34. *Лаппо И. И.* Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия: Литовско-русский повет и его сеймик. — Юрьев : Тип. К. Маттисена, 1911. — 624 с.
35. *Лаппо И. И.* Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569—1586): Опыт исследования политического и общественного строя. — Пб. : Тип. И. Н. Скороходова, 1901. – Т. 1. — 780 с.
36. *Ливанцев К. Е.* История государства и права средних веков. — СПб. : Питер, 2003. — 283 с.
37. *Ливанцев К. Е.* Сословно-представительская монархия в Польше, ее сущность и особенности (II половина XIV — конец XVI в.). — Л. : Изд-во Ленингр. ун-та, 1968. — 79 с.
38. *Лисейцев Д. В.* Посольский приказ в эпоху Смуты : монография. — М. : ИРИ РАН, 2003. — 264 с.
39. *Любавский М. К.* Литовский канцлер Лев Сапега о событиях смутного времени. — М. : Университ. тип., 1901. — 16 с.
40. *Любавский М. К.* Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждений в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства. — М. : Университет. тип., 1900. — 850 с.
41. *Магилина И. В.* Московское государство и проект антитурецкой коалиции в конце XVI — начале XVII вв. : автореф. дис. ... канд. истор. наук : 07.00.02. — Волгоград, 2009. — 30 с.
42. *Мальцев В. П.* Борьба за Смоленск (XVI—XVII). — Смоленск, 1940. — 420 с.
43. *Новодворский В.* Борьба за Ливонию между Москвою и Речью Поспалитой (1570—1582). — Пб. : Тип. И. Н. Скорохода, 1904. — 304 с.

44. *Новодворский В. В.* О взятии Полоцка войсками Стефана Батория в 1579 году. — Полоцк : Издатель Л. Ф. Данько, 1997. — Вып. 3. — 22 с. — (Б-ка «Полоцкого летописца»).
45. Око всей великой России: Об истории рус. диплом. службы XVI—XVII вв. / [А. П. Богданов, И. В. Галактионов]. — М.: Междунар. отношения, 1989. — 240 с.
46. *Павлов А. П.* Государев двор и политическая борьба при Борисе Годунове (1584—1605 гг.). — СПб. : Наука, Санкт-Петербург. отделение, 1992. — 278 с.
47. *Пашуто В. Т., Флоря Б. Н., Хорошкевич А. Л.* Древнерусское наследие и исторические судьбы восточного славянства: Киев. Русь и ист. судьбы вост. славян ; Акад. наук СССР, Отд-ние истории. — М. : Наука, 1982. — 262 с.
48. Переписка между Россией и Польшей по 1700 год, собранная по дипломатическим бумагам управляющим Московским архивом Коллегии иностранных дел Н. Н. Бантыш-Каменским. — М., 1861. — Ч. 1: 1487—1584 гг. — 189 с.
49. *Платонов С. Ф.* Москва и Запад; Борис Годунов. — М. : Богород. печатник, 1999. — 283 с.
50. Подлинное свидетельство о взаимных отношениях России и Польши, преимущественно во время самозванцев / сост. П. Муханов. — М. : Тип. С. Сельвинского, 1834. — 274 с.
51. *Пресняков А. Е.* Лекции по русской истории. Западная Русь и Литовско-русское государство. — М. : Соцэкгиз, 1939. — Т. II. Вып. I.— 284 с.
52. *Рогожин Н. М.* Посольские книги начала XVII в. как исторический источник: (07.00.09) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. — М., 1983. — 20 с.
53. *Рогожин Н. М.* Посольские книги России конца XV — начала XVII вв. / Рос. акад. наук, Ин-т рос. истории. — М., 1994. — 223 с.
54. *Рогожин Н. М.* Посольский приказ: колыбель российской дипломатии / М-во ин. дел Рос. Федерации, Рос. Акад. наук, Ин-т рос. истории. — М. : Междунар. отношения, 2003. — 432 с.
55. *Рогожин Н. М.* У государевых дел быть указано... / Мин-во иностр. дел Рос. Федерации и др. — М. : Изд-во РАГС, 2002. — 285 с.
56. *Сергеев Ф. П.* Русская дипломатическая терминология XI—XVII вв. / под ред. д-ра филол. наук, проф. М. А. Брицина. — Кишинев : Картя молдовеняскэ, 1971. — 219 с.
57. *Сирутавичюс М.* Тенденции в исследовании истории внешней политики Великого княжества Литовского в литовской историографии последнего десятилетия // Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991—2003 гг. = Grand Duchy of Lithuania: history of research, 1991—2003: матэрыялы міжнар. круглага стала «Гісторыя вывучэння Вялікага княства Літоўскага ў 1991—2003 гг.», Гродна (16—18 мая 2003 г.) / рэдкал. : С. Б. Каўн (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: Медисонт, 2006. — С. 238—246.
58. *Скрынников Р. Г.* Борис Годунов. — М. : Наука, 1978. — 192 с.
59. *Скрынников Р. Г.* Россия накануне «смутного времени». — М. : Мысль, 1985. — 206 с.
60. Славяне и их соседи. Католицизм и православие в средние века : сб. тез. докл. конф. / редкол. : Б. Н. Флоря (отв. ред.) [и др.]. — М. : ИСБ, 1991. — 90 с.
61. Славяне и Россия : сб. ст. К 70-летию со дня рождения С. А. Никитина / АН СССР. Ин-т славяноведения и балканистики. — М. : Наука, 1972. — 308 с.
62. Славянский мир между Римом и Константинополем : сборник статей / Российская академия наук, Ин-т славяноведения. — М. : Индрик, 2004. — 269 с.
63. *Соловьев С. М.* История России с древнейших времен. 1463—1584. — М. : АСТ; Харьков : Фолио, 2001. — Кн. III. — 992 с.
64. *Соловьев С. М.* История России с древнейших времен. 1584—1613. — М. : АСТ; Харьков : Фолио, 2001. — Кн. IV. — 960 с.
65. *Тарас А. Е.* Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV—XVII веках. — М. : АСТ; Минск : Харвест, 2008. — 798 с.
66. *Тихомиров М. Н.* Российское государство XV—XVII вв. — М. : Наука, 1973. — 422 с.
67. *Тихомиров М. Н.* Россия в XVI столетии. — М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1962. — 583 с.
68. *Ульяновский В.* Смутное время. — М. : Европа, 2006. — 447 с.
69. *Филюшкин А.* Изучение Великого княжества Литовского и Речи Посполитой в российской историографии 1990-х гг.: проблемы, тенденции и перспективы // Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991—2003 гг. = Grand Duchy of Lithuania: history of research, 1991—2003: матэрыялы міжнар. круглага стала «Гісторыя вы вучэння Вялікага княства Літоўскага ў 1991—2003 гг.», Гродна (16—18 мая 2003 г.) / рэдкал. : С. Б. Каўн (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Медисонт, 2006. — С. 8—16.
70. *Флоря Б. Н.* О текстах русско-польского перемирия 1591 г. // Славяне и Россия : сб. ст. К 70-летию со дня рождения С. А. Никитина / АН СССР, Ин-т славяноведения и балканистики; редкол. : Ю. В. Бромлей (отв. ред.) [и др.]. — М. : Наука, 1972. — С. 71—80.
71. *Флоря Б. Н.* Отношения государства и церкви у восточных и западных славян: (Эпоха средневековья) // Брестская уния 1596 г. Исторические причины. — М. : ИСБ, 1992. — Ч. 1. — 157 с.
72. *Флоря Б. Н.* Польско-литовская интервенция в России и русское общество. — М. : Индрик, 2005. — 415 с.
73. *Флоря Б. Н.* Русско-польские отношения и балтийский вопрос в конце XVI — начале XVII вв. — М., 1973. — 222 с.
74. *Флоря Б. Н.* Русско-польские отношения и политическое развитие Восточной Европы во второй половине XVI — начале XVII вв. — М., 1978. — 300 с.
75. *Хорошкевич А. Л.* Россия в системе международных отношений середины XVI века. — М. : Древлехранилище, 2003. — 622 с.
76. *Щербатов М. М.* История российская от древнейших времен. — Пб. : При Имп. Акад. наук, 1790. — Т. 6 : От начала царствования царя Федора Иоанновича до его кончины. Ч. 1 : От возшествия на престол царя Феодора Иоанновича до убиения царевича Димитрия. — 362 с.

77. *Щербатов М. М.* История российская от древнейших времен. — Пб. : При Имп. Акад. наук, 1790. — Т. 6 : От начала царствования царя Федора Иоанновича до его кончины. Ч. 2 : От убиения царевича Димитрия до кончины царя Феодора Иоанновича. — 297 с.
78. *Щербатов М. М.* История российская от древнейших времен. — Пб. : При Имп. Акад. наук, 1790. — 366 с.
79. *Эрлих Г.* Царь Борис, прозваньем Годунов. — М. : Яуза : Эксмо, 2006. — 480 с. — Т. 7 : От кончины царя Феодора Иоанновича до избрания царя Михаила Феодоровича, дому Романовых. Ч. 1 : Царствование царя Бориса Феодоровича и его сына.
80. *Юзефович Л. А.* «Как в посольских обычаях ведется». Рус. посол. обычай конца XV — начала XVII в. — М. : Междунар. отношения, 1988. — 214 с.
81. *Юзефович Л. А.* Посольский обычай Российского государства конца XV — начала XVII в.: автореф. дис. ... канд. ист. наук : 00.07.02 / Перм. гос. пед. ин-т. — Пермь : Звезда, 1981. — 14 с.
82. *Янушкевiч А.* Беларуская гiстарыяграфiя гiсторыi знешняй палiтыкi Вялiкага княства Лiтоўскага: асноўныя тэндэнцыi i перспектывы развiцця // Вялiкае княства Лiтоўскае: гiсторыя вывучэння ў 1991—2003 гг. = Grand Duchy of Lithuania: history of research, 1991—2003: матэрыялы мiжнар. круглага стала «Гiсторыя вывучэння Вялiкага княства Лiтоўскага ў 1991—2003 гг.», Гродна, 16—18 мая 2003 г. / рэдкал. : С. Б. Каўн (адк. рэд.) [i iнш.]. — Мiнск : Медисонт, 2006. — С. 139—148.
83. *Biaszczyk G.* Polska historiografia Wielkiego ksikstwa Litewskiego w latach 1990—2003 // Вялiкае княства Лiтоўскае: гiсторыя вывучэння ў 1991—2003 гг. = Grand Duchy of Lithuania: history of research, 1991—2003 : матэрыялы мiжнар. круглага стала «Гiсторыя вывучэння Вялiкага княства Лiтоўскага ў 1991—2003 гг.», Гродна, 16—18 мая 2003 г. / рэдкал. : С. Б. Каўн (адк. рэд.) [i iнш.]. — Мiнск : Медисонт, 2006. — С. 336—373.
84. *Floria B.* Magnateria litewska z Rosją w czasie drugiego bezkrólewia // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. — 1977. — № 22. — S. 143—158.

**Lashkevich S.** ***Russian Pre-revolutionary, Soviet and Modern Russian Historiography on Foreign Policy of the Great Duchy of Lithuania and the Muscovy State in the Late 16th Century***

*The article analyzes the Russian historiography on relations between the Great Duchy of Lithuania and the Muscovy State in the late XVI century. The researcher has outlined three periods in the historiography of this issue: pre-revolutionary historiography, historiography of the Soviet period and contemporary historiography. The author pays much attention to the studies of dozens of Russian researchers beginning with the scientific works of M. Shcherbatov and ending with the works of recent decades.*

Статья поступила в редакцию 3 октября 2012 г.